ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта
А.В.Клімовіч
«__» ________ 2025 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю ўзорных тэатральных калектываў "Слонімскія цудадзействы"

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю ўзорных тэатральных калектываў "Слонімскія цудадзействы" (далей – Фестываль).

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю з'яўляецца: актывізацыя дзейнасці і папулярызацыя ўзорных тэатраў вобласці; падтрымка, стымуляванне і развіццё аматарскай творчасці; удасканальванне выканальніцкага майстэрства, развіццё творчых здольнасцей удзельнікаў аматарскіх калектываў, пошук новых сцэнічных формаў ажыццяўлення тэатральных пастановак; далучэнне малодшага пакалення да аматарскага тэатральнага мастацтва; утварэнне новых і ўмацаванне дзеючых дзіцячых калектываў.

3. Арганізатарамі Фестывалю з'яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, дзяржаўная ўстанова культуры "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" (далей – ДУК "Гродзенскі АМЦНТ"), аддзел культуры Слонімскага раённага выканаўчага камітэта.

4. Пры арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні Фестывалю арганізатары і ўдзельнікі кіруюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўднай Інструкцыяй.

5. Агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Фестывалю ажыццяўляецца арганізацыйным камітэтам (далей – аргкамітэт), склад якога зацвярджаецца дадаткова (Дадатак 1).

6. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама аб пераносе даты правядзення Фестывалю (у іншыя тэрміны).

7. Праграма Фестывалю прадугледжвае ўрачыстае адкрыццё, конкурсныя прагляды, падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне дыпломамі ў рамках і прызамі.

8. У Фестывалі прымаюць удзел лепшыя “ўзорныя” аматарскія тэатральныя калектывы Гродзенскай вобласці незалежна ад ведамаснай прыналежнасці.

9. У Фестывалі (па рашэнні аргкамітэта) можа прыняць удзел калектыў, які не мае наймення “ўзорны”, але з’яўляецца лаўрэатам абласнога агляду-конкурсу аматарскіх тэатральных калектываў.

10. Згодна праграме Фестывалю ў якасці госця можа быць запрошаны Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь.

11. З мэтай творчай вучобы на Фестываль запрашаюцца рэжысёры і кіраўнікі тэатральных калектываў вобласці.

12. Фестываль праводзіцца 1 раз у 2 гады.

13. У 2025 годзе Фестываль праводзіцца 4-5 красавіка на базе дзяржаўнай установы культуры “Слонімскі раённы цэнтр культуры”.

14. У выпадку пераносу тэрмінаў правядзення Фестывалю ці яго адмены па аб’ектыўных прычынах калектывы, якія даслалі заяўкі, будуць паведамлены індывідуальна.

15. Калектывы могуць выкарыстоўваць для пастаноўкі спектакляў творы нацыянальнай ці сусветнай драматургіі, аўтарскія творы на беларускай (рускай) мове.

16. Да паказу прадстаўляецца спектакль працягласцю да 40 хвілін.

17. Журы Фестывалю (Дадатак 2) вызначае лаўрэатаў (I, II, III ступені) і ўзнагароджвае іх прызамі і дыпломамі ў рамках.

18. Спецыяльнымі прызамі і дыпломамі ў рамках узнагароджваюцца пераможцы ў наступных намінацыях:

“За лепшую рэжысуру”;
“За лепшы дэбют”;
“За ўдалы творчы эксперымент”;
“За лепшую жаночую ролю”;
“За лепшую мужчынскую ролю”;
“За лепшую ролю другога плана”;
“За лепшую сцэнаграфію”;
“За лепшае музычнае афармленне”;
“За лепшы акцёрскі ансамбль”;
“За творчую індывідуальнасць і майстэрства”.

19. Астатнія калектывы ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел у Фестывалі.

20. Журы мае права змяняць, вызначаць дадатковыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду.

21. Пры падвядзенні вынікаў Фестывалю журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі: майстэрства рэжысёра, акцёрскае майстэрства, сцэнаграфія, музычнае афармленне, культура сцэны, касцюміраванне.

22. Рашэнне членаў журы па выніках Фестывалю фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца не пазней 10 каляндарных дзён з дня правядзення Фестывалю на афіцыйным сайце ДУК "Гродзенскі АМЦНТ".

23. Для ўдзелу ў Фестывалі неабходна да 24 лютага 2025 г. даслаць заяўку (Дадатак 3) і відэаверсію спектакляў (для папярэдняга прагляду) на электронны адрас: info@gromc.by.

Да заяўкі неабходна дадаць не менш за 2 фотаздымкі калектыву-удзельніка (1920*1080px Full HD). Тэл. +375 152 623785, тэл/факс: +375 152 623787.

24. Па выніках журы папярэдняга прагляду відэаверсій спектакляў (Дадатак 4), аб удзеле ў Фестывалі калектывам будзе паведамлена індывідуальна.

25. Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі АМЦНТ".

26. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: заработная плата члену журы, праезд члена журы, набыццё прызоў і спецыяльных прызоў, дыпломаў і рамак для дыпломаў.

27. Для фінансавання Фестывалю могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

28. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама перанос даты правядзення Фестывалю (у іншыя тэрміны).

29. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю ўзорных тэатральных калектываў “Слонімскія цудадзействы”

СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога фестывалю ўзорных тэатральных калектываў
“Слонімскія цудадзействы”

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта*; |
| Юшкевіч Т.В. | намеснік старшыні Слонімскага райвыканкама, *намеснік старшыні аргкамітэта*; |
| Адамчык М.А. | дырэктар ДУК “Слонімскі раённы цэнтр культуры”; |
| Данільчык Г.В. | начальнік аддзела культуры Слонімскага райвыканкама; |
| Мерчы Т.І. | загадчык аддзела аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Ткачоў А.М. | дырэктар ДУК “Слонімскі драматычны тэатр”; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю ўзорных тэатральных калектываў "Слонімскія цудадзействы"

СКЛАД ЖУРЫ
абласнога фестывалю ўзорных тэатральных калектываў
"Слонімскія цудадзействы"

| | |
|---|---|
| Катавіцкі В.У. | загадчык кафедры рэжысуры, дацэнт тэатральнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў", старшыня экспертнай камісіі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, *старшыня журы*; |
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *сустаршыня журы;* |
| Калагрыў А.А. | акцёр ДУК "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь "Гродзенскі абласны драматычны тэатр", *намеснік старшыні журы;* |
| Пятроўская М.А. | выкладчык тэатральных дысцыплін УА "Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў"; |
| Міхальчык В.У. | вядучы майстар сцэны, актрыса ДУК "Слонімскі драматычны тэатр"; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" |

Дадатак 3
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю ўзорных тэатральных калектываў “Слонімскія цудадзействы”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
начальнік аддзела (загадчык сектара) культуры гар(рай)выканкама
«___» ________________ 2025 г.

З А Я Ў К А
на ўдзел у абласным фестывалі ўзорных тэатральных калектываў
“Слонімскія цудадзействы”

1. Раён ________________________________________________________
2. Поўная назва калектыву і базавая ўстанова дзейнасці калектыву ______
______________________________________________________________
3. Прозвішча, імя, імя па бацьку мастацкага кіраўніка калектыву ________
______________________________________________________________
4. Колькасць дзеючых асоб у спектаклі ______________________________
5. Конкурсная праграма калектыву (аўтар, назва твора, іншыя звесткі) ___
______________________________________________________________
6. Працягласць выступлення і працягласць манціроўкі дэкарацыі ________
7. Неабходныя тэхнічныя сродкі, светлавое абсталяванне_____________
______________________________________________________________
8. Кантактныя тэлефоны________________________________________

Кіраўнік базавай установы ___________________
*(подпіс)*

Заяўку на ўдзел у Фестывалі, а таксама відэаверсію спектакляў неабходна даслаць да 24 лютага 2025 г. на электронны адрас: info@gromc.by з пазнакай “На фестываль узорных тэатральных калектываў “Слонімскія цудадзействы”. Тэл. +375 152 623785, тэл/факс: +375 152 623787.

Дадатак 4
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю ўзорных тэатральных калектываў “Слонімскія цудадзействы”

СКЛАД ЖУРЫ
папярэдняга прагляду відэаверсій спектакляў абласнога фестывалю ўзорных тэатральных калектываў “Слонімскія цудадзействы”

| | |
|---|---|
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, *старшыня журы;* |
| Мерчы Т.І. | загадчык аддзела аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, *намеснік старшыні журы*; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст аддзела культурна-асветнай работы, мастацтваў і навучальных устаноў упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Пятроўская М.А. | выкладчык тэатральных дысцыплін УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”; |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |